***Литература***

1. Мельник, В.А. Государственная идеология Республики Беларусь / В.А. Мельник. – Минск, 2003. – 240 с.
2. Фукуяма, Ф. Конец истории? / Ф. Фукуяма // Философия истории. Антология. – М., 1997. – С. 290–310.
3. Громыко, Л.Н. Стыд: Размышление о наболевшем / Л.Н. Громыко. – Минск, 2008. – 52 с.
4. Основы идеологии белорусского государства / В.В. Шинкарев, Г.В. Корзенко, С.П. Романова и др. – Минск, 2009. – 27 с.

## МАСТАЦКІЯ КАНЦЭПЦЫІ АРХІТЭКТУРЫ: АГУЛЬНАТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

Ю.Ю. Захарына, БДПУ (Мінск)

Мастацкая канцэпцыя з'яўляецца асноўным змястоўным кампанентам аналіза архітэктуры з пункту гледжання мастацтвазнаўства. Пры дапамозе мастацкай канцэпцыі становіцца магчымым раскрыць спецыфіку архітэктурных пабудоў і збудаванняў, вылучыць традыцыйныя і наватарскія рысы ў архітэктуры пэўнага культурна-гістарычнага перыяду (эпохі), ацаніць вопыт папярэдніх пакаленняў дойлідаў і суаднесці яго з сучасным, выявіць эстэтычны патэнцыял архітэктурных аб'ектаў, асэнсаваць дынаміку развіцця асноўных функцыянальных, канструкцыйна-тэхнічных і эмацыянальна-эстэтычных элементаў архітэктуры ва ўзаемадзеянні, галоўнымі з якіх з'яўляюцца аб'ём, форма, канструкцыя і дэкор.

Мастацкая канцэпцыя грунтуецца на базісных, ключавых асаблівасцях архітэктуры, выяўленне якіх дазваляе ідэнтыфікаваць будынкі і збудаванні ў адпаведнасці з канцэптуальным падыходам. Мастацкая канцэпцыя архітэктуры ўлічвае сістэму першапачаткаў (асноў), фактараў, сродкаў, прынцыпаў мастацка-эстэтычнай выразнасці і дазваляе прадставіць эвалюцыю тых ці іншых яе змястоўных кампанентаў, якія складаліся пад уплывам мастацка-эстэтычных і сацыяльных патрэб, поглядаў, густаў грамадства.

На сённяшні дзень праблема выбару мастацкай канцэпцыі абвастрылася. Дынаміка сучаснай культуры з інтэнсіўнымі тэмпамі развіцця, усечасовай зменай патрабаванняў і запытаў грамадства ў многім вызначыла няўстойлівасць мастацкіх вобразаў, іх недаўгавечнасць. Адзінага мастацкага стылю – як агульнасці вобразнай сістэмы, сродкаў мастацкай выразнасці, творчых прыемаў, абумоўленых адзінствам мастацкага зместу, якая пануе ў культуры на працягу адносна доўгага часу, – ужо на працягу стагоддзя не існуе, што ўносіць пэўныя цяжкасці ў аналіз мастацкіх працэсаў, з'яў і вобразаў. Новыя мастацкія вобразы фарміруюцца ў межах кароткачасовых стылявых кірункаў, мастацкіх школ або ў творчасці асобных мастакоў (архітэктараў) і з часам становяцца знакавымі ўзорамі для пераймання. Аднак сучасныя мастацкія вобразы існуюць нядоўгі час, абмяжаваны двума-трыма дзесяцігоддзямі, відазмяняюцца, трансфармуюцца, зведаўшы ўплыў іншых мастацка-вобразных кампанентаў, што суіснуюць нароўні.

Асабліва выразна адзначаная з'ява праявілася ў архітэктуры апошняй чвэрці XX – пачатку XXI стагоддзя. У гэты час вобразы архітэктуры становяцца шматграннымі, паколькі сінтэзуюць рэтра-элементы, характэрныя для гістарычных стыляў, у спалучэнні з найноўшымі, стаўшымі вынікам глабальнага прагрэса ў галіне тэхналогій. У архітэктуры адзначаецца стылявая разнастайнасць вобразаў неарацыяналізму, постмадэрнізму, неамадэрнізму, хай-тэку, якія ў так званам «чыстым» выглядзе існуюць у абмежаванай колькасці. Мастацкія вобразы

архітэктуры апошняй чвэрці XX – пачатку XXI стагоддзя вызначае сімбіёз неарацыяналістычнага, рэтраспектыўнага і авангарднага пачаткаў, якія суіснуюць паралельна або пераплятаюцца. У выніку на сённяшні дзень стылявая канцэпцыя губляе сваю значнасць і не можа ўжывацца ў мастацтвазнаўчым аналізе самастойна, без уліку іншых канцэптуальных поглядаў. Таму паўстала вострая неабходнасць перагляду значнасці стылявога падыходу да аналізу архітэктуры і ўліку ўсёй сукупнасці мастацкіх канцэпцый, кожная з якіх мае свае пазітыўныя і негатыўныя бакі.

Акрамя стылявой, асноўнымі мастацкімі канцэпцыямі архітэктуры з'яўляюцца мастацка-вобразная, прасторавая і канструкцыйна-тыпалагічная.

*Стылявая канцэпцыя*, якая атрымала распаўсюджанне з Новага часу, прадугледжвае ўстойлівасць прынцыпаў, норм, правіл, якія трывала замацаваліся ў пэўных тыпах пабудоў. Стылявая канцэпцыя ўлічвае шырокі спектр сродкаў мастацкай выразнасці архітэктуры (аб'ём, сілуэт, прапорцыі, кампазіцыю, маштаб, рытм, тэктоніку, фактуру і колер матэрыялаў, сістэму дэкаратыўнага аздаблення) і дае адносна поўную характарыстыку архітэктуры пэўнага гістарычнага перыяду. У той жа час яна ігнаруе многія тыпы пабудоў і збудаванняў – масты, шляхаправоды, танэлі, часткова жылыя і гаспадарчыя пабудовы, архітэктуру малых форм. Стылявая канцэпцыя ўжываецца ў асносінах да аналізу архітэктуры Еўропы і Амерыкі з перыяду Сярэднявечча да XX ст. У факталагічнай канстатацыі стылю неабходнай умовай з'яўляецца масавы характар. Але ў такім выпадку унікальныя архітэктурныя пабудовы і збудаванні ігнаруюцца стылявой канцэпцыяй. Таму гэту канцэпцыю асуджаюць многія даследчыкі за яе непаўнату, недасканаласць і немагчымасць яе выкарыстання для ўсебаковага асэнсавання пытанняў сучаснай архітэктуры. Так, французскі даследчык П. Шабар сцвярджае, што выкарыстанне ў мастацтвазнаўчым аналізе толькі стылявой характарыстыкі не дазваляе раскрыць сутнасці мастацкіх канцэпцый і выключае аналіз творчай дзейнасці буйных мастацкіх школ і арганізацый – «Der Sturm», «De Stijl», «L'esprit nouveaux» і інш. [1].

*Мастацка-вобразная канцэпцыя* ўяўляе эстэтычную характарыстыку матэрыяльна арганізаванага асяроддзя жыццядзейнасці чалавека, якая адлюстроўвае непадзельнае адзінства функцыянальных, канструкцыйна-тэхнічных і эмацыянальна-эстэтычных элементаў, увасобленых у архітэктурных аб'ектах. Асноўнымі канцэптамі выступаюць аб'емна-прасторавая кампазіцыя, форма (канфігурацыя), канструкцыя і дэкор. Мастацка-вобразная канцэпцыя можа ўжывацца для аналізу ўсіх тыпаў пабудоў і збудаванняў, уключаючы архітэктуру малых форм, і дазваляе асэнсаваць эвалюцыю вобразаў горада (паселка, аграгарадка і іншага населенага пункта). Яскравым прадстаўніком мастацка-вобразнай канцэпцыі выступае французскі мастацтвазнаўца М. Карпо, які пазбягае стылявой характарыстыкі архітэктуры і ўжывае такія вобразныя характарыстыкі, як пластычная, тэхнічная, эксцэнтрычная архітэктура і інш. [2]. Прыхільнікам гэтай канцэпцыі з'яўляецца нямецкі мастацтвазнаўца М. Петэр, які аналізуе развіццё сучаснага дойлідства на падставе вылучэння сродкаў мастацкай выразнасці [3]. Мастацка-вобразная канцэпцыя архітэктуры прадстаўлена і ў айчынным мастацтвазнаўстве ў адносінах да сучаснай архітэктуры Беларусі [4–5] і дазваляе раскрыць змест пануючай мастацка-вобразнай сістэмы. Аднак, як і іншыя мастацкія канцэпцыі, мастацка-вобразная мае недахопы: яна грунтуецца на вылучэнні знакавых элементаў, вобразаў-сімвалаў, што часам вядзе да перабольшвання значэння фармальнага аспекту аналізу.

*Прасторавая канцэпцыя*, яскрава прадстаўленая ў сучасным мастацтвазнаўстве Англіі, раскрывае эвалюцыю архітэктуры праз выяўленне яе сувязі з ландшафтным асяроддзем. Прыхільнікі прасторавай канцэпцыі крытычна ставяцца да стылявой характарыстыкі развіцця архітэктуры. Пацверджаннем можа служыць крытыка Ф. Прыні і А. Дэмарціні стылявой канцэпцыі і абвінавачванне яе ў заблытанасці тэрмінаў, адсутнасці дакладнай вызначанасці стылявой тэрміналогіі. У якасці прыклада Ф. Прыні і А. Дэмарціні аналізуюць ужыванне тэрміна «мадэрн», які разумеецца ў мастацтвазнаўстве як «новы стыль». Яны сцвярджаюць, што тэрмін «мадэрн» упершыню быў ужыты ў V стагоддзі пры апісанні форм хрысціянскай архітэктуры, якая пераймала рымскія. Пазней тэрмін «мадэрн» стаў ужывацца для характарыстыкі архітэктуры эпохі Сярэднявечча, бо мастацтва сярэдніх стагоддзяў было новым у параўнанні з антычным. У канцы XIX стагоддзя азначаны тэрмін замацаваўся за стылем, які адраджаў сярэдневяковыя формы архітэктуры, пераймаў элементы дойлідства краін Усходу і спалучаў іх з сучаснымі формамі і канструкцыйнымі вырашэннямі [6, с. 4–5]. Спецыфічны характар архітэктуры, які вылучае яе сярод іншых відаў мастацтва, заключаецца ў яе «прасторавасці». Пры эстэтычнай ацэнцы твораў архітэктуры даецца не толькі аналіз яе прасторавай кампазіцыі ў трох вымярэннях, але і аналіз яе інтэр'ера, і узаднасінаў пабудовы (збудавання) з ландшафтным асяроддзем. У выніку «прасторавасць» з'яўляецца галоўным змястоўным кампанентам архітэктуры.

*Канструкцыйна-тыпалагічная канцэпцыя* атрымала шырокі рэзананс у мастацтвазнаўстве 1970–90-х гадоў, што было звязана з ужываннем новых тыпаў канструкцый (асабліва ў жыллёвай архітэктуры), якія спрыяюць хуткаму будаўніцтву. На гэтай падставе вылучаюць панэльныя, маналітныя, цагляныя, каркасныя і іншыя пабудовы. Але аналіз канструкцыйных сістэм дае ў большай ступені тэхнічную характарыстыку архітэктуры, у той час як эстэтычная – асноўная для мастацтвазнаўства – адыходзіць на другі план.

Такім чынам, для асэнсавання эвалюцыі архітэктуры адной мастацкай канцэпцыі недастаткова. Толькі комплексны аналіз стылявых, мастацка-вобразных, прасторавых, канструкцыйных і іншых асаблівасцей дазволіць прадставіць сутнасную характарыстыку развіцця архітэктуры.

***Літаратура***


1. Chabard, P. Actualités livres: Alan Colquhoun. L'architecture moderne (2006) / P. Chabard // L'architecture d'aujourd'hui. – 2007. – № 369. – P. 4–6.
2. Carpo, M. Actualités livres: Charles Jencks. The Iconic Building. The Power of Enigma (2005) / M. Carpo // L'architecture d'aujourd'hui. – 2007. – № 368. – P. 4-6.
3. Peter, M. Bode. Integratives Wohnen fur Alt und Jung in Ingolstadt / M. Peter // Art-magazin. – 2000. – № 3. – P. 129.
4. Захарына, Ю.Ю. Мастацкі вобраз архітэктуры Беларусі апошняй чв. XX – пач. XXI ст.: манаграфія / Ю.Ю. Захарына. – Мінск: БДПУ, 2008. – 224 с.
5. Шамрук, А.С. Архитектура Беларуси XX – начала XXI в.: эволюция стилей и художественных концепций / А.С. Шамрук. – Мінск, 2007. – 335 с.
6. Prina, F. 1000 Years of World Architecture / F. Prina, E. Demartini. – London: Thames & Hudson Ltd., 2006; reprinted 2007. – 429 p.